Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (698) ● ПЯТНІЦА, 23 ЛЮТАГА 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

*50 год Узброеных Сіл СССР*

**СЁННЯ ЎВЕСЬ САВЕЦКІ НАРОД РАЗАМ З ВОІНАМІ АРМІІ І ФЛОТА ЎРАЧЫСТА СВЯТКУЕ ПАЎВЯКОВЫ ЮБІЛЕЙ УЗБРОЕНЫХ СІЛ КРАІНЫ САВЕТАЎ**



# ГЕРАІЗМ, МУЖНАСЦЬ, ГУМАНІЗМ

Савецкай Арміі 50 год. Сёння на ўсіх кантынентах адзначаюць гэтую знамянальную падзею. Такога яшчэ не бачыла гісторыя. І гэта заканамерна. Створаныя У. І. Леніным і Камуністычнай партыяй Савецкія Узброеныя Сілы з першых дзён свайго існавання сталі на абарону свабоды і мірнай працы будаўнікоў сацыялізма, усяго прагрэсіўнага чалавецтва. У памяці людзей ніколі не згаснуць подзвігі салдатаў і камандзіраў, ваеначальнікаў і палітработнікаў, якія адстаялі незалежнасць першай сацыялістычнай айчыны, ліквідавалі пагрозу фашысцкага зняволення. Не выпадкова ў Берліне, у цэнтры Еўропы, узвышаецца бронзавая фігура савецкага салдата, які ў правай руцэ трымае меч, а левай па-бацькоўску ласкава прыціскае да грудзей маленькую дзяўчынку. На ўсіх этапах свайго развіцця Савецкая Армія была прыкладам служэння народу, міру і шчасцю. Вось чаму ў свядомасці перадавых людзей уяўленне аб Савецкай Арміі асацыіруецца з масавым гераізмам, мужнасцю і высокім гуманізмам.

Яе непераможная моц, сіла — у адзінстве з народам, з мудрым кіраўніцтвам партыі. Гады Айчыннай вайны паказалі, што Савецкая Армія карэнным чынам адрозніваецца ад армій капіталістычных краін. Яна па-сапраўднаму складаецца з мірных людзей і служыць міру. Яскравым прыкладам таму можа быць і наш універсітэт. Цяпер у ім працуе звыш 300 удзельнікаў Айчыннай вайны. Да вайны яны вучыліся ў школах і інстытутах, працавалі на калгасных палях і ў прамысловасці, займаліся навуковымі даследаваннямі...

Вораг перарваў мірную працу савецкіх людзей. За зброю ўзяліся маладыя і старыя. І даказалі, што зброю яны ўмеюць трымаць цвёрда, як аловак і штурвал камбайна, малаток і плуг... Вопытным ваенным разведчыкам становіцца сялянскі хлапчук Антон Лабуда, сёння намеснік дэкана фізфака; бясстрашным воінам ужо з першых баёў зарэкамендаваў сябе студэнт-першакурснік з гістфака Сяргей Скапцоў; падпольшчыкамі і смелымі партызанамі сталі былыя супрацоўнікі універсітэта М. Я. Рэзнікаў, І. Г. Некрашэвіч і іншыя. Такіх прыкладаў з баявога жыцця нашых акадэмікаў, прафесараў, дацэнтаў, інжынераў і лабарантаў можна прывесці многа. Прафесар філфака М. Р. Ларчанка ў час вайны быў намеснікам камандзіра роты; С. М. Мяцельскі з падрыхтоўчага факультэта ўзначальваў камсамольскую арганізацыю батальёна; загадчык кафедры навуковага камунізма М. Р. Круцько дзесяткі раз вадзіў у атаку сваю роту марской пяхоты; далёка ад межаў сваёй рэспублікі закончыў баявы шлях сямнаццацігадовы юнак Уладзімір Кулажанка, цяпер выкладчык палітэканоміі... Сярод былых франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў, якія працуюць сёння ва універсітэце, ёсць прадстаўнікі амаль усіх буйных аперацый Савецкай Арміі, воіны ад радавога да генерала, з іх чатыры Героі Савецкага Саюза — А. А. Філімонаў, А. В. Кірсанаў, Д. П. Жмуроўскі, М. Я. Зайцаў. С. А. Лысенка, П. Г. Лазавая, Т. Р. Шарко, В. А. Захарава, М. І. Алікевіч, Т. М. Мартынюк, Д. П. Багрова, Я. Л. Прыбыткова — гэтыя і іншыя супрацоўніцы універсітэта таксама былі воінамі. Цяпер яны, як і да вайны, займаюцца мірнай працай. А на яе абароне стаяць авеяныя баявой славай Узброеныя Сілы.

Дзякуючы клопатам партыі, урада, усяго народа, Савецкая Армія мацнее з кожным годам. Растуць і яе рэзервы. Сведкам асаблівай увагі партыі да абароны Радзімы з'яўляюцца рашэнні трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

# Горача віншуем

Калі б мяне спыталі, дзе і кім я хачу быць, я б адразу адказаў: «У арміі і байцом!»

Чаму так? Гэта ж зразумела... Сёння ў нашых сяброў вялікае свята — дзень нараджэння арміі Савецкага Саюза.

В'етнамскія студэнты, навучэнцы падрыхтоўчага факультэта БДУ добра ведаюць гісторыю яе стварэння і развіцця. У цяжкіх умовах яна нараджалася, але дзякуючы ленінскім клопатам, клопатам Камуністычнай партыі і ўсяго народа яна вырасла і ўзмужнела.

Мы захапляемся подзвігамі байцоў і захоўваем памяць тых, хто аддаў жыццё за мір, за свабоду, за шчасце чалавецтва.

Зараз мы жывем у Савецкім Саюзе і добра ведаем, што Савецкая Армія вельмі моцная.

У час святкавання 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі мы бачылі яе магутную баявую тэхніку. Мы вельмі ганарымся, што ў нас такі вялікі і мужны сябра, як Савецкі Саюз і яго слаўная армія.

Мы горача віншуем савецкіх людзей з вялікім святам 50-годдзя Узброеных Сіл СССР.

**ДЗІНЬ ВАН ТХОНГ.**

# Прысвячаецца юбілею

Цікава і ўрачыста адзначае слаўны юбілей Савецкай Арміі наш ардэнаносны універсітэт. На ўсіх факультэтах адбыліся святочныя вечары, сустрэчы з ветэранамі грамадзянскай і Айчыннай войнаў, былымі падпольшчыкамі і партызанамі. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі падрыхтавалі стэнды, на якіх адлюстроўваецца баявы шлях выкладчыкаў і супрацоўнікаў, а рэдкалегіі насценгазет выпусцілі спецыяльныя, па-мастацку аформленыя нумары.

★★★

Лектары універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды», якой шмат год кіруе актыўны ўдзельнік партызанскага руху на Беларусі дацэнт М. Я. Рэзнікаў, прачыталі дзесяткі дакладаў па гісторыі Савецкай Арміі і па іншых ваенна-патрыятычных тэмах. Яны былі гасцямі воінаў сталічнага гарнізона, многіх гарадоў Беларусі.

★★★

Вялікую работу па падрыхтоўцы да свята правяла бібліятэка. Тут арганізаваны кніжныя выстаўкі, адбыліся цікавыя гутаркі і канферэнцыі па кнігах, прысвечаных Савецкай Арміі.

★★★

67 удзельнікаў Айчыннай вайны — супрацоўнікаў універсітэта, якія праслужылі дваццаць і больш гадоў у арміі — сёння атрымаюць медалі «50 год Узброеных Сіл СССР».

★★★

Сёння ў актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца ўрачысты вечар калектыва універсітэта, прысвечаны 50-годдзю Савецкай Арміі.



# ЯШЧЭ НЕ БЫЛО ЗАГАДУ...

Гэтаму фотаздымку роўна 25 год. Не толькі час вінаваты ў тым, што ён не вельмі выразны, галоўнае — у выкананні. Здымак зроблен беларускімі партызанамі ў зямлянцы.

А было гэта так. Да дзяржаўных экзаменаў у Кіеўскім універсітэце заставалася некалькі дзён, калі пачалася вайна. Многіх студэнтаў эвакуіравалі ў тыл, група выпускнікоў аказалася ў далёкім Самаркандзе. Была сярод іх і камсамолка Таня з Беларусі. Да вайны яна захаплялася стралковым спортам, скончыла школу снайпераў, паспяхова выступала на спаборніцтвах. Мабыць, гэта і адыграла асноўную ролю ў тым, што яе першую накіравалі на работу—інструктарам у Багішамальскі райваенкамат. Разам з дарослымі мужчынамі яна рыхтавала чыгуначнікаў, хлапкаробаў на фронт, вывучала з імі зброю, вучыла трапна страляць. І вучыла выдатна.

Адно аддзяленне змяняла другое. Людзі адпраўляліся на фронт. Камсамолка і сама імкнулася туды, дзе вырашаўся лёс Радзімы. Яна не раз звярталася да камісара і яго памочнікаў, была ў гарадскім і абласным ваенкаматах. Усюды адзін адказ: «Няма загаду браць на фронт жанчын...»

А час ішоў. Таццяну Іванаўну назначылі начальнікам штаба МПВО Цэнтральнага раёна горада. Яна выконвала адказныя даручэнні ваеннага камандавання. І ўсё ж... у Маскву, у ЦК ВЛКСМ паляцела пісьмо з просьбай адправіць на фронт.

Замест адказу з Масквы, з ЦК КПБ прыйшоў тэлеграфны выклік. Кароткія зборы — і старажытны горад застаўся ззаду. У Маскве камсамолка скончыла школу спецыяльнага назначэння і была накіравана ў тыл ворага. Больш года інструктар ЦК камсамола Беларусі правяла сярод народных мсціўцаў. Правяла... Гэта не тое слова, якім можна характарызаваць яе жыццё ў сорак другім і трэцім. Яна пабывала ў 17 партызанскіх атрадах (ад Віцебска да самай польскай граніцы), стварала ў іх камсамольскія арганізацыі, праводзіла сходы, канферэнцыі, вучыла моладзь, актыўна ўдзельнічала ў баях.

У лютым сорак трэцяга, пасля выканання задання, ёй было загадана вярнуцца ў Маскву. Фронт зноў праходзіла пяшком. Вось тады і сшылі ёй партызаны кажушок і шапку, а нехта сфатаграфаваў. Здымак трапіў да яе толькі пасля вайны. Цяпер Т. І. Прытыцкая — дацэнт, узначальвае кафедру гісторыі КПСС.

# ЯНЫ БЫЛІ ПЕРШЫМІ

Нядаўна воіны легендарнай Іркуцка-Пінскай дывізіі сустрэліся з ветэранамі сваёй часці, з тымі, хто першым стаў пад яе чырвоны сцяг. Быў сярод іх і Аляксандр Васільевіч Кірсанаў, прарэктар нашага універсітэта. Многія гады свайго жыцця аддаў ён абароне Радзімы ад ворагаў, прайшоў шлях ад салдата да генерала, у гады Айчыннай вайны камандаваў дывізіяй. За ўмелае кіраўніцтва войскамі, мужнасць і стойкасць ён удастоен звання Героя Савецкага Саюза, узнагароджан многімі ардэнамі і медалямі.

На названай сустрэчы прысутнічаў яшчэ адзін ветэран Узброеных Сіл СССР выкладчык універсітэта, член партыі з 1917 года, палкоўнік у адстаўцы І. А. Кажанкоў. Сялянскім хлапчуком на Смаленшчыне яшчэ задоўга да Кастрычніка ён стаў прымаць актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе. Потым франты грамадзянскай вайны, служба ў Чырвонай Арміі. У 1918 годзе на Усерасійскім з'ездзе Саветаў І. А. Кажанкову пашанцавала бачыць і чуць Уладзіміра Ільіча Леніна. Памяць аб гэтай падзеі засталася на ўсё жыццё. У дні святкавання 50-годдзя Савецкай улады за актыўны ўдзел у рэвалюцыі і грамадзянскай вайне старэйшы камуніст універсітэта І. А. Кажанкоў узнагароджан ордэнам Леніна.

Многа можа расказаць аб сваіх першых гадах службы ў Чырвонай Арміі выкладчык М. М. Клімко. Міхаіл Мікалаевіч — актыўны змагар сацыялістычнай рэвалюцыі ў Маскве, ён таксама неаднаразова сустракаўся з Леніным. А пачаў сваё служэнне працоўнаму народу яшчэ ў 1905 годзе, калі салдатам прыняў удзел у першай рускай рэвалюцыі.

Праслухаўшы прамову Леніна 1 мая 1918 года на Краснай плошчы, Міхаіл Мікалаевіч піша заяву ў партыю камуністаў. Па прапанове Леніна, з якім апошні раз сустракаўся на I Усерасійскім з'ездзе работнікаў сельскай гаспадаркі, М. М. Клімко пайшоў вучыцца. Ён скончыў рабфак БДУ, Ціміразеўку, займаўся ў Кенігсбергскім універсітэце, Баварскай акадэміі, Вышэйшай сельскагаспадарчай школе ў Берліне. Цяпер працуе ў нас, вучыць журналістаў.

Сёння мы віншуем таксама ветэрана Савецкай Арміі, баявога паплечніка Яна Фабрыцыуса, удзельніка падаўлення Кранштацкага мяцяжа Антона Канстанцінавіча Цітка, які пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі і да мінулага года працаваў на біялагічным факультэце.

Ідуць гады, старэюць тыя, хто першым ішоў на штурм старога ладу, адстойваў заваёвы рэвалюцыі. Але яны бачаць, упэўнены, што справа, за якую змагаліся, перамагла, развіваецца і квітнее. А ці можа быць іншае найвялікшае шчасце, чым служэнне народу, будучым пакаленням!

Дык са святам, родным святам Вас, першыя чырвонагвардзейцы і чырвонаармейцы!

П. СЕЛІВАНАЎ.

# ЧЫРВОНЫ СЦЯГ НАД МІНСКАМ

*У кожнага чалавека ёсць пеpажытыя моманты, якія не толькі не сціраюцца ў памяці, а наадварот, становяцца яшчэ больш выразнымі, акрэсленымі да драбніц. Такой падзеяй у маім жыцці было вызваленне Мінска.*

*У сорак першым з болем у сэрцы я пакідаў гэты горад, які стаў асабліва дарагім для мяне за час вучобы ва універсітэце і ў аспірантуры. Гітлераўская авіяцыя знішчала ўсё, што было нам дорага, што было створана намі ў цяжкай працы. Праз тры гады я ўбачыў Мінск яшчэ больш разбураным, але настрой ужо быў другі. Наша армія, агітатарам палітаддзела якой я быў, уварвалася з боем у горад, калі захопнікі імкнуліся дашчэнту знішчыць тое, што засталося. Памятаю, што толькі з цокальнага паверха Дома ўрада мы вывезлі некалькі сот тон бомбаў і ўзрыўчаткі. Замініраваны былі і многія іншыя будынкі. Немцы падпалілі горад, і гэта яшчэ больш ускладніла вулічныя баі, але ворагу ўжо нішто не магло дапамагчы.*



*Ніколі не забуду, з якой радасцю сустракалі Савецкую Армію мінчане. Яшчэ грымелі гарматы, стракаталі кулямёты, а ва ўсіх канцах горада праходзілі нікім не скліканыя мітынгі. Насельніцтва аказвала вялікую дапамогу ў тушэнні пажараў, навядзенні парадку. Мужчыны атакоўвалі нашы машыны з просьбай зараз жа залічыць іх байцамі. Вялікай была ў людзей нянавісць да ворага. Аднойчы мы праводзілі мітынг на вуглу вуліц Нямігі і Камсамольскай. Прамоўцы закончылі сваё выступленне заклікамі: «Смерць фашысцкім захопнікам!» Якраз у гэты момант нашы салдаты вялі па Нямізе вялікую калону ваеннапалонных. Сотні мінчан кінуліся на гітлераўцаў, каб расправіцца з імі за перажытыя здзекі, пакуты...*

*Па просьбе ўрада рэспублікі камандаванне арміі вылучыла мяне ў склад Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі. Прыкладна два тыдні знаёміўся я з тымі стратамі, якія панеслі наша навука, культура. Калі вярнуўся ў палітупраўленне пасля выканання даручэння, многія мяне не пазналі. Я доўга не мог супакоіцца ад пабачанага, прачытанага, праслуханага.*

*Нягледзячы на гэта, верылася, што Мінск будзе аднаўлены, хутка залечыць свае цяжкія раны, бо над ім зноў лунае наш, чырвоны сцяг. А пакуль што мы рухаліся наперад, дабіваючы ворага. Тады гэта было самай лепшай дапамогай Мінску і мінчанам.*

*І. ЛУШЧЫЦКІ,*
*прафесар.*

*На здымку: гвардыі маёр І. М. Лушчыцкі (злева) праводзіць семінар з палітсаставам часці.*

# НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ

Чэрвень, 1944 год. Першы Беларускі фронт. Аршанскі напрамак. У той час я быў намеснікам камандзіра асобнага сапёрнага батальёна. З нецярпеннем чакаем загаду — «Наперад!» І вось ён — пракладваць дарогу наступаючым войскам па тэрыторыі Беларусі.

Інжынернае забеспячэнне баявых дзеянняў стралковай дывізіі, наперадзе якой мы дзейнічалі, аказалася справай вельмі цяжкай і складанай. Гітлераўскія войскі выкарыстоўвалі прыродныя рубяжы, усе магчымасці, каб затрымацца, перасеклі Беларусь міна-узрыўнымі лініямі, умацаванымі баявымі перашкодамі. Але ўжо нічога не магло затрымаць наступленне Савецкай Арміі.

Ноччу з 22 на 23 чэрвеня дзве роты нашага батальёна зрабілі праходы ў складаным лабірынце варожых перашкод, і дывізія паспяхова атакавала захопнікаў і пагнала іх на Захад.

Праз некалькі дзён смелым налётам рота сапёраў захапіла і размініравала мост на Дняпры ў раёне Оршы і па ім прайшлі не толькі воіны дывізіі, але і многіх часцей 31-й арміі.

Другая водная перашкода — рака Беразіна. Мы фарсіравалі яе на поўдзень ад Барысава. І тут батальён вызначыўся. Разам пантоннікамі сапёры своечасова прабіліся да ракі і пад агнём праціўніка навялі мост. Наступленне дывізіі не спынілася.

Чым бліжэй нашы часці да Мінска — тым больш жорстка абараняюцца гітлераўцы. 2 ліпеня авангардныя падраздзяленні дывізіі выходзяць на Маскоўскую шашу ў раёне Смалявіч. Недалёка ад пасёлка на мінах падарваліся два нашы танкі. На дапамогу спяшаюцца сапёры. Так і ёсць — дарогі, масты замініраваны. Салдаты і афіцэры батальёна пад варожым агнём ачышчаюць шлях дывізіі да Мінска. У баях за Смалявічы высокую мужнасць праявіў кулямётчык Аляксандр Рашчупкін. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

І вось Мінск. Дывізія разам з іншымі злучэннямі ўрываецца ў горад. Тут сапёрам таксама хапіла работы — тысячы мін выцягнулі мы з-пад зямлі, фундаментаў захаваных дамоў.

Але ў Мінску мы доўга не затрымліваемся. Наш шлях ляжыць на Захад, туды, дзе яшчэ ў фашысцкім рабстве мучацца савецкія людзі — нашы бацькі, браты, сёстры, дзеці. Дывізія вызваляе Ліду, Гродна, фарсіруе Нёман і выходзіць на тэрыторыю Польшчы.

За вызваленне Оршы дывізія атрымала назву Аршанскай, за баі ў Мінску—Мінскай, а за вызваленне Гродна атрымала ордэн Леніна. Я ганаруся тым, што ў складзе гэтага праслаўленага злучэння Савецкай Арміі вызваляў многія сёлы і гарады Беларусі, вызваляў Мінск. Ганаруся тым, што жыву і працую ў Мінску, які стаў для мяне родным: гэта горад-барацьбіт, працаўнік, носьбіт передавой навукі і культуры.

І. МАЗЖУХІН,
выкладчык, удзельнік вызвалення Беларусі.



# АДЗІН З ПЛЕЯДЫ ГЕРОЯЎ

Я сяджу ў вялікай светлай аўдыторыі на трэцім паверсе. Недзе там, за вокнамі, крочыць па вуліцах гул гарадскога жыцця, а тут, на чарговую 45-мінутную вахту стала цішыня. Ідзе лекцыя па гісторыі КПСС. За кафедрай пажылы, высокага росту мужчына. Я гляджу на яго і стараюся адшукаць тую разыначку, тую асаблівасць, якая, па-маёй унутранай упэўненасці павінна быць прысутна Герою Савецкага Саюза. Я шукаю і не знаходжу, настолькі простым і звычайным паўстае гэты чалавек.

Ён гаворыць аб грамадзянскай вайне, аб ваеннай інтэрвенцыі, аб цяжкасцях, якія перажывала маладая рэспубліка Саветаў у тыя віхурыстыя гады. І я уяўляю сабе вёску Кучын, што ў Гомельскай вобласці, уяўляю шэрыя, з выветранымі рэбрамі бярвенняў, сялянскія хаты і галечу, якая настойліва стукалася ў кожную з іх. Цяжка даводзілася і сям'і Філімонавых. Маці працавала ад світання да позняга вечара, каб пракарміць траіх дзяцей. Яна абаранялася, як магла, але голад нярэдка святкаваў перамогу. Ён прымусіў старэйшага з братоў, 12-гадовага Сашку, пайсці працаваць калгасным конюхам. Хлопчык выбіваўся з сіл, але не адступаў.

Выраслі брат і сястра. Жыць стала лягчэй. Моладзь пацягнулася да ведаў. Гэтая смага неспазнанага свету прывяла вясковага хлопца Сашу Філімонава ў Барысаўскі лесатэхнікум. Але вучыцца доўга яму не прыішлося: Саша пашкодзіў руку. Ён вяртаецца дамоў у родны калгас. Працуе сакратаром сельсавета, потым піянерважатым. Жыццё бурліла навокал, але і ў гэтым вадавароце яго не пакідае пачуццё незадаволенасці. Аляксандр праседжвае бяссоннымі начамі за падручнікамі.

У 1937 годзе ён пераязджае ў Мінск і паступае на падрыхтоўчы факультэт Камуністычнага інстытута журналістыкі. А ў 1939-ым ЦК партыі накіроўвае Філімонава з таварышамі ў Лунінец. Там хлопцы амаль год выпускаюць гарадскую газету.

Саша закончыў другі курс, калі пачалася вайна. Як студэнт ён мог атрымаць адтэрміноўку, але гэта значыла, адыйсці ад барацьбы. Філімонаў падае заяву ў танкавае вучылішча. Жадаючых было многа, але Сашу, як студэнту, была аддадзена перавага.

У 1942 годзе Аляксандр на выдатна закончвае вучылішча. На фронце 24-гадовы лейтэнант камандуе ўзводам. Яго танк нясе смерць фашыстам. Малады камуніст помсціць за гора і слёзы бацькоў і дзяцей, за загінуўшага брата.

Гвардзейская танкавая рота, якой камандаваў старшы лейтэнант Філімонаў, удзельнічала ў жорсткіх баях пад Курскам і Белгарадам, фарсіравала Днепр. Толькі ў баях за населены пункт Добрыкаў экіпаж танка, у складзе якога быў Філімонаў, знішчыў тры варожых гарматы, сем кулямётаў з разлікамі і каля 25 салдат і афіцэраў.

Баі ішлі на чужой зямлі, баі не менш упартыя, чым на роднай. Тут Філімонаў атрымаў самую высокую ўзнагароду для воіна—ордэн Леніна і медаль Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза. Вось сціплыя радкі са спіска ўзнагарод: «...У баях з нямецкімі захопнікамі паказаў сябе добрым, арганізаваным, смелым і мужным афіцэрам. Рота ў поўным саставе, без страт імкліва фарсіравала рэкі Нэйсе і Шпрэе, паспяхова праходзіла наперад, знішчаючы пункты супраціўлення, і адбівала контратакі праціўніка ў Берліне, рота адбіла больш 10 контратак і знішчыла 11 танкаў і самаходных пушак, 11 палявых пушак, 35 агнявых кулямётных пунктаў, 45 вазоў з ваеннай маёмасцю, 20 грузавых аўтамабіляў і каля 500 гітлераўскіх салдат і афіцэраў».

Здаўся Берлін, за Берлінам—Прага. Грудзі героя ўпрыгожылі ордэны Айчыннай вайны II ступені і Чырвонай Зоркі, медалі «За ўзяцце Берліна» і «За вызваленне Прагі».

Адгрымелі гарматы. Краіна вярталася да мірнай працы, і Філімонаў зноў за студэнцкай партай.

Ён быў адным з першых пасляваенных рэдактараў газеты «Беларускі універсітэт».

Ззаду — гады вучобы ў аспірантуры, абарона кандыдацкай дысертацыі. Цяпер Аляксандр Андрэевіч Філімонаў — дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

Як і на фронце, ён там, дзе больш горача, дзе кіпіць жыццё. Узнагародай яму за гэта—медаль «За доблесную працу» і яшчэ больш, чым узнагарода — павага людзей.

**В. СОЛІН.**

## НАЧАЛЬНІК ШТАБА

**Мала хто ведае ва універсітэце, што самы малады доктар філасофскіх навук у рэспубліцы Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны быў адным з актыўных удзельнікаў шырокага партызанскага руху супроць фашысцкіх захопнікаў. У юначым узросце ён узяў зброю ў рукі і жорстка помсціў ворагу за гвалты і здзекі над родным беларускім людам. За мужнасць і вынаходлівасць у хуткім часе ён быў вылучан начальнікам штаба аднаго з партызанскіх атрадаў брыгады імя Заслонава і на гэтай пасадзе сустрэў наступаючыя часці Чырвонай Арміі.**

**Прайшлі гады. Але цяжкія часы барацьбы не пакідаюць памяць. Мікалай Ігнатавіч да драбніц помніць жорсткія баі за мястэчка Бачэйкава, за вёску Галавічы, дэталі рэльсавай вайны на чыгунцы Орша — Віцебск. Колькі атрымана бліскучых перамог!**

**Былы начальнік штаба партызанскага атрада з-за сціпласці неахвотна расказвае аб сабе і сваім удзеле ў баях, хоць і мае тры ўрадавыя ўзнагароды. Больш ахвотна ён гаворыць аб людзях, аб розных сустрэчах. Неяк на лёд Жэрынскага возера, размешчанага ў партызанскай зоне, зімой 1944 года сеў падбіты савецкі самалёт. Партызаны кінуліся да самалёта. Збянтэжаныя лётчыкі не ведалі што рабіць. Да іх беглі ўзброеныя людзі, але хто яны! Затое колькі было абдымкаў, калі лётчыкі даведаліся, што гэта нашы партызаны.**

**Больш месяца партызаны ахоўвалі самалёт, сваімі сіламі адрамантавалі яго, здабылі бензін і адправілі на Вялікую Зямлю. Бяручы курс на ўсход, самалёт па просьбе партызан абстраляў з гарматы і кулямётаў паліцэйскі гарнізон у вёсцы Вяжоўка.**

**У. КУЛАЖАНКА,**
**в. а. дацэнта, кандыдат эканамічных навук.**

## КАЛІ ПАТРЭБНА БЫЛО...

**У гады Вялікай Айчыннай вайны мне давялося быць удзельніцай партызанскага руху ў атрадзе імя Сяргея Лазо партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь».**

**І вось цяпер, праз дваццаць пяць гадоў, просьба рэдакцыі расказаць у газеце аб якім-небудзь цікавым эпізодзе з майго партызанскага жыцця, прывяла мяне ў тупік.**

**Справа ў тым, што я была самым радавым удзельнікам руху, я рабіла тое, што патрабавалася ад мяне і ўсіх нас, што дыктавалася ўмовамі жыцця.**

**Калі патрэбна было, я станавілася байцом падрыўной роты і прымала ўдзел у знішчэнні варожых цягнікоў.**

**Калі патрэбна было, я разам з усімі была ўдзельніцай рэйкавай вайны, калі патрэбна было, я выконвала функцыі санітара, медыцынскай сястры, пісара штаба атрада, патруля і г. д.**

**У тыя гады мы не задумваліся над тым, цікава ці не даручанае заданне, небяспечна яно ці не, ці ёсць у ім што-небудзь гераічнае. Мы рабілі ўсё, гэта таму, што ў гэтым было наша жыццё.**

**Н. ПОЛЯК,**
**дацэнт кафедры аналітычнай хіміі.**





*У гэтай ваеннай форме прайшлі праз цяжкія гады вайны супрацоўнікі фізічнага факультэта дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі А. Н. Казарын, лабарант кафедры фізікі І. К. Кубрак, старшы лабарант кафедры фізікі С. А. Домнышаў і асістэнт кафедры фізікі М. І. Марэнка.* *Фота Г. МАРОЗАВА.*

★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★★

# У ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

**Пажоўклыя лісткі з расплыўшыміся пячацямі і подпісамі, абгарэлыя фотаздымкі — рэліквіі баявой славы старанна збіраюць выкладчыкі і студэнты нашага універсітэта — тут на працягу ўжо некалькіх год ствараецца летапіс удзелу БДУ ў Айчыннай вайне. Асабліва багаты матэрыял сабраны і апрацаваны на кафедры гісторыі БССР, якой кіруе член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР прафесар Л. С. Абэцэдарскі.**

**Летапіс яшчэ не закончан, а ў фотатэцы, напрыклад, ужо звыш двухсот здымкаў ваенных гадоў. На іх вы ўбачыце яшчэ зусім маладых Герояў Савецкага Саюза А. А. Філімонава і Д. П. Жмуроўскага — цяпер выкладчыкаў кафедры гісторыі КПСС, чубатага старшыну — сёння вядомага беларускага пісьменніка кандыдата філалагічных навук І. Я. Навуменку, дацэнтаў А. В. Шыбаеву з фізфака, С. Я. Янчанку — загадчыка кафедры палітэканоміі, С. А. Лысенка — з філфака, П. З. Савачкіна —дэкана гістфака і многіх іншых удзельнікаў вайны.**

**Выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага універсітэта ў ліку першых мінчан пайшлі на фронт. Многія з іх аддалі жыццё за Савецкую Айчыну. Пад Мажайскам, адбіваючы танкавую атаку, загінуў выдатнік вучобы, стыпендыят імя XX-годдзя Ленінскага камсамола Леанід Сокал; смерцю герояў загінулі сакратары камітэта камсамола Іван Рыбакоў і Абрам Фердэр, студэнт геафака старшы лейтэнант Мікалай Кукарэка; памёр ад ран пры абароне Гомеля студэнт Канстанцін Некрашэвіч. Мабыць, пройдуць яшчэ гады, пакуль будуць устаноўлены імёны ўсіх універсітэцкіх таварышаў, загінуўшых у баях з ворагам на франтах, на партызанскіх сцежках. Але аб іх будзе ведаць кожны студэнт, кожны супрацоўнік, бо памяць змагароў за свабоду — бессмяротна.**

**С. МАЙСКАЯ.**

Л. Л. Кароткая — выкладчык рускай літаратуры на філалагічным факультэце. У гады Айчыннай вайны гэтая сціплая жанчына была адной з самых мужных і бясстрашных падпольшчыц на Беларусі.

# БАЯВЫЯ КІЛАМЕТРЫ СТАРШЫНЫ ДУДЗІЧА

*Шафёра Міхаіла Міхайлавіча Дудзіча вайна застала ў Брэсце, дзе ён са сваім начальнікам быў у камандзіроўцы. У Мінск вярнуўся ўжо пацямнеўшым ад парахавога дыму, а тут трапіў пад бомбы. Дома нікога не застаў— жонка з месячным сынам, як паведамілі суседзі, у час налёту гітлераўскай авіяцыі пайшла ў бомбасховішча, ды так і не вярнулася.*

*Міхаіла Міхайлавіча ўключылі ў загараджальны атрад, у складзе якога ён абараняў Магілёў, Віцебск, Гомель. Пасля баёў пад Гомелем — адказная камандзіроўка ў Куйбышаў. Тут прапанавалі застацца працаваць у тыле, але шафёр настаяў на адпраўцы на фронт: «Я павінен адпомсціць за спалены Мінск, за сям'ю, за ўсіх савецкіх людзей...».*

*І вось Старыца пад Калінінам. Тут фарміравалася адна са стралковых дывізій. Аднойчы, ужо перад адпраўкай, у аўтароту прыйшоў малады лейтэнант.*

*— Мінчане ёсць?,— спытаў ён у камандзіра.— Землякоў шукаю.*

*— Дудзіч!—паклікаў той.*

*Кароткай была сустрэча былога аспіранта Беларускага універсітэта Міхаіла Міхайлавіча Драко і шафёра Міхаіла Міхайлавіча Дудзіча. У той жа дзень дывізія накіравалася ў раён баёў.*

*— Калі вымераць шлях нашай дывізіі,— успамінае намеснік дэкана завочнага факультэта дацэнт М. М. Драко,—то ён складзе многія тысячы кіламетраў — ад Калінінскіх лясоў да горада Печы ў Венгрыі. Але Дудзіч на сваім ЗІСу праехаў у некалькі разоў больш. Я не памятаю выпадка, калі мой цёзка не быў падрыхтаваны да выканання любога задання камандавання. Дарэчы, за ўсю вайну ён змяніў толькі дзве машыны, і апошнюю здаў у Львове грамадзянскім уладам з ацэнкай першай катэгорыі.*

*Я ганарыўся ім не толькі як выдатным шафёрам, але і надзвычай баявым таварышам. Колькі разоў Дудзіч аказваўся на валаску ад смерці! Памятаецца наступленне ва Ўсходняй Прусіі. Ішлі, як кажуць, без прывалаў. Аднойчы, у час такога маршу, Дудзіч на сваім паслухмяным ЗІСу праскочыў на кіламетры тры ва ўладанні ворага. І тут ён не разгубіўся.*

*Так, баявыя медалі, дзесяткі падзяк сведчаць аб тым, што Міхаіл Міхайлавіч Дудзіч быў не простым перавозчыкам снарадаў і ваенных грузаў. Як самую дарагую рэліквію захоўвае ён вось гэты дакумент:*

*«Сержанту Дудзічу М. М. Прыказам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза тав. Сталіна за ўдзел у баях па вызваленню ад нямецкіх захопнікаў сталіцы Беларускай ССР г. Мінска, аператыўна важных гарадоў і чыгуначных вузлоў Оршы, Барысава і фарсіраванне р. Беразіны аб'яўлена падзяка».*

*Капітан Драко дэмабілізаваўся раней, у Празе. Са сваім цёзкай ён дамовіўся сустрэцца ў Мінску. Сустрэча адбылася ў канцы сорак пятага, і з таго часу М. М. Дудзіч працуе шафёрам ва універсітэце. Яго добра ведаюць, паважаюць і выкладчыкі, і студэнты.*

*Неяк Міхаіл Міхайлавіч Драко падлічыў, што яго франтавы таварыш за трыццаць год наездзіў звыш мільёна кіламетраў, з іх тысяч дзвесце—баявыя кіламетры — самыя цяжкія і незабыўныя. А галоўнае, яны таксама служылі і служаць міру, шчасцю людзей.*

*С. КРАВЕЦ.*





# НА ЎЛАСНЫМ САМАЛЁЦЕ

22 чэрвеня 1941 года. У гэты дзень мы, курсанты Мелітопальскага авіяцыйнага вучылішча штурманаў, павінны былі здаваць апошні выпускны экзамен па метэаралогіі. І раптам... вайна.

— Рыгор! — звярнуўся да мяне мой сябра, украінец, родам з-пад Нежына Іван Ледзень, — як бы нам заўтра адправіцца на фронт?..

У гэты ж дзень мы падалі на імя начальніка вучылішча рапарты аб адпраўцы нас на фронт. Сотні мелітопальцаў праважалі нас. Праз восем дзён мы прыехалі ў... Хабараўск. Японія сканцэнтравала велізарную армію ў Манчжурыі і чакала зручнага моманту, каб перайсці ў наступленне.

Бясконцыя трывогі, дні і ночы дзяжурылі ў самалётах. Мы добра разумелі, што ў гэтыя цяжкія дні патрэбны тут, на Далёкім Усходзе, але фронт цягнуў да сябе. Аднойчы я прачытаў у газеце аб тым, што супругі Лойка купілі за свае асабістыя зберажэнні танк і адпраўляюцца на ім біць фашыстаў.

«А што, калі параіцца са сваімі хлопцамі», — падумаў я. І вось пад купалам самалёта — я, Васіль Ульянаў (лётчык) і Васіль Школін (тэхнік) вядзем размову аб набыцці свайго ўласнага самалёта. Вядзем падлікі. Не хапае грошай. Вырашылі прадаць усё, што ў каго ёсць. Як не хочацца мне прадаваць свой баян! Час ад часу ён адганяў ад мяне сум па сваіх родных, блізкіх, што жывуць недзе далёка на маёй роднай Бабруйшчыне. Але інтарэсы Радзімы, што можна параўнаць з імі!.. І мы прадаём усё, застаемся ў адных камбінізонах. Потым кароткае пісьмо Галоўнакамандуючаму і адказ ад яго: «Дзякую за турботы аб ваенна-паветраных сілах, — гаварылася ў ім, — ваша жаданне будзе задаволена».

На Каўказе мы атрымалі «свой» самалёт. Нас надзвычай цёпла і ветліва сустрэлі ў палку. А неўзабаве надышоў час і першага баявога вылету. На станцыі Жмерынка скапілася шмат варожай тэхнікі і салдат. Як старанна рыхтаваліся мы да першага баявога вылету!

Упэўнена вядзе самалёт Ульянаў, я пільна сачу за маршрутам, падлічваю, колькі часу застаецца ляцець да цэлі. За некалькі кіламетраў нас сустрэў люты зенітны заслон ворага. Манеўруем. І вось станцыя. Самалёты ляглі на баявы курс. Я прынік да прыцэла і як толькі першы эшалон танкаў папаў у перакрыжаванне сеткі прыцэла — націснуў кнопку механічнага скідальніка бомб. Смертаносны груз паляцеў на галовы фашыстаў. Уключаю фотакамеру і назіраю за тым, што робіцца на станцыі: там цэлае пекла — сотні разбітых вагонаў, танкаў, трупы салдат, гвалт і беганіна, паніка. «Вось вам, гады! Смерць за смерць!».

Украіна, Бесарабія, Венгрыя, Румынія... І ўсё вылеты і вылеты, а потым цяжкае раненне. 11 месяцаў у шпіталі, зноў у страі, сустрэча са сваімі баявымі сябрамі. Зноў вылеты у Чэхаславакію, Аўстрыю, зноў сотні бомб ляцяць на галовы фашысцкіх разбойнікаў.

Дзень Перамогі мы сустрэлі ў Чэхаславакіі. Гэта быў неапісальна радасны дзень. Але мы правялі яго ў блакітных вышынях, бо прыходзілася яшчэ знішчаць фашыстаў, якія не хацелі здавацца ў палон.

Як хутка ляціць час! Ужо дваццаць тры гады прайшло з дня нашай Вялікай Перамогі. Мы не забыліся нічога з тых грозных часоў.

**Р. БУЛАЦКІ,**
**кандыдат гістарычных навук, дэкан журфака.**



*Сімвал мужнасці і гераізму савецкіх воінаў — Брэсцкая крэпасць - герой.*
*Фота І. АСКІРКІ.*

*Наследнікі славы бацькоў і дзядоў, юныя «конармейцы» ў час гульняў.*
*Фота А. НІКАЛАЕВА.*

# ПАД ДЫМАВЫМ ПРЫКРЫЦЦЁМ

*Гэта было ў ліпені, жніўні і верасні 1942 года, калі ішлі жорсткія баі пад Сталінградам. Першая тэхбрыгада атрымала баявую задачу — прыкрыць дымам горад Саратаў і не даць магчымасці авіяцыі разбамбіць чыгуначны мост праз раку Волгу ў раёне горада Саратава і выратаваць асноўныя прамысловыя прадпрыемствы і, асабліва, нафтаперагонны завод «Крэкінг», які забяспечваў Сталінград бензінам для тэхнікі нашых войск.*

*Нямецкая авіяцыя штодзённа па тры-чатыры разы рабіла налёты на горад Саратаў і імкнулася разбамбіць чыгуначны мост і завод «Крэкінг». Але, дзякуючы мужнасці і стойкасці салдат і афіцэраў першай тэхнічнай брыгады і маракоў Волжскай флатыліі, яны былі выратаваны з дапамогай дымавога прыкрыцця горада Саратава на плошчы ў 60 квадратных кіламетраў і чыгуначнага маста праз Волгу. Дымавая завеса на сушы стваралася за пяць-дзесяць мінут да падыходу нямецкай авіяцыі да цэлі са спецыяльных машын, а па Волзе ў раёне маста на некалькі кіламетраў рабіла дым з катэраў Волжская флатылія. Гэту задачу паставіў асабіста Маршал Варашылаў.*

*За выкананне гэтага баявога задання салдаты і афіцэры былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі.*

*М. ІШУЦІНАЎ,*
*выкладчык.*

# ГОРДАЕ ІМЯ — ГВАРДЫЯ

У Расіі гвардыя была створана Пятром І. Спачатку яна складалася з Сямёнаўскага і Прэабражэнскага палкоў. Пазней гэтае ганаровае званне прысвойвалася найбольш баяздольным пяхотным, артылерыйскім часцям і караблям ваенна-марскога флоту.

Савецкая гвардыя нарадзілася ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны. У верасні 1941 года гонару насіць імя гвардзейскай баявой адзінкі Чырвонай Арміі першай удастоілася легендарная 100-я дывізія, праславіўшая сябе ў баях з фашысцкімі захопнікамі пад Мінскам. Летам і восенню мінулага года школьнікі Астрашыцкага Гарадка правялі раскопкі курганаў, на якіх праходзілі траншэі пярэдняга краю дывізіі. У выніку пошукаў, у якія ўключыліся выкладчыкі і студэнты універсітэта, устаноўлены імёны многіх воінаў, загінуўшых у баях за сталіцу Беларусі.

У ліку першых званне гвардзейскіх прысвоена таксама 127, 153 і 161 стралковым дывізіям. Гэта было ў час Смаленскай бітвы.

На франтах Айчыннай вайны гвардзейцы выконвалі самыя цяжкія і адказныя баявыя задачы. На гвардыю трымалі раўненне ўсе войскі. Яна адыграла велізарную ролю ў разгроме фашысцкіх захопнікаў.

Цяпер гвардзейскія часці і злучэнні складаюць найбольш баяздольны атрад Савецкіх Узброеных Сіл.

# ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ ТРАДЫЦЫЙ

**Шматтысячны калектыў членаў ДТСААФ універсітэта сустракае юбілей Савецкай Арміі вялікімі поспехамі ў прапагандысцкай рабоце, загартоўцы і патрыятычным выхаванні моладзі. У васьмі абаронных секцыях і 29 каў. Толькі за час спаборніцтва, прысвечанага 50-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, падрыхтавана 1448 стралкоў, гуртках займаецца звыш 2 тысяч студэнтаў і выкладчыз іх 122—разраднікі, 390 матацыклістаў і шафёраў, многа парашутыстаў, радыёаматараў і іншых спецыялістаў.**

**Па выніках агляду абаронна-масавай работы за 1967 год універсітэцкая арганізацыя ДТСААФ заняла трэцяе месца ў рэспубліцы сярод вышэйшых навучальных устаноў і першае месца ў Ленінскім раёне горада Мінска. Яна ўзнагароджана граматамі і пераходным прызам, а таксама значком ДТСААФ «За актыўную работу».**

**Выконваючы рашэнні трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета СССР, члены ДТСААФ універсітэта з кожным днём памнажаюць свае поспехі, яны з'яўляюцца надзейным рэзервам Савецкай Арміі.**

**В. ЛАПШЫН,**
**старшыня камітэта ДТСААФ.**

# АБ ТЫХ, ХТО ВЫСТАЯЎ

*Акадэмік АН БССР, прафесар нашага універсітэта Н. П. Яругін быў удзельнікам баёў за Ленінград. У 1961 годзе ў выдавецтве АН БССР выйшла кніжка яго ўспамінаў аб тых днях. Ніжэй мы друкуем урывак з гэтай кнігі.*

## САЛДАЦКІЯ СЛЁЗЫ

**Прывёз мяне Харчэўнікаў у санпункт палка і здаў урачам. Тут разрэзалі на шматкі валёнкі, штаны, бялізну — здымаць не было магчымасці. Перавязалі, укуталі ў коўдру і зноў палажылі на санкі, каб адвезці ў санбат.**

**У гэты момант прыйшлі старшына батарэі Ваяводзін і Цыганкоў.**

**Ваяводзін сардэчна і сціпла нёс свае абавязкі ў батарэі, па-сапраўднаму і глыбока хваляваўся за ўсіх салдат. Засмучаны прыйшоў ён развітацца са мной.**

**Цыганкоў увесь гэты дзень тэрмінова фарміраваў свой узвод. Убачыўшы мяне, спыніўся як укапаны і стаяў, нібы статуя, моўчкі, а з вачэй цяклі слёзы. Нязвыкла было бачыць гэтага незвычайна мужнага, бясстрашнага чалавека, моцнага, як крэмень, у слязах.**

**У салдат гэта бывае. У іх больш пачуцця, чым у іншых, хоць і не адразу гэта бачна. Суровая доля. У апошнюю гадзіну ён асцярожна падыйшоў і палажыў свой сённяшні паёк цукру мне на грудзі пад коўдру.**

**— Табе патрэбна, — сказаў ён, змахваючы слязу.**

**Мяне павязлі ў санбат, а Цыганкоў зараз жа пайшоў займаць мае агнявыя пазіцыі. Толькі ноччу ён прыйшоў у Колпіна, прыцягнуўшы сваю апошнюю, разбітую пушку. На світанні спяшаючыся пачаў фарміраваць свой узвод (дакладней паўзвода). А калі крыху сцямнела, Цыганкоў ужо заняў пазіцыі другога ўзвода.**

**З пятага кастрычніка па дваццаць другога лютага другі ўзвод штодзённа толькі ад метадычнага турботнага агню прымаў на сябе ўдар каля двухсот буйнакаліберных снарадаў і мін.**



# У ГОНАР СВЯТА

На падрыхтоўчым факультэце адбыўся агляд мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 50-годдзю Узброеных Сіл СССР. Лепшыя нумары — «Песня аб Мінску», «Ленін заўжды жывы», «Марш вызвалення Паўднёвага В'етнама» у выкананні хору, «Кацюша», якую задушэўна спявае Ле Дык Зы, «Дзе ж вы цяпер, сябрыаднапалчане» ў выкананні Ха Ван Кы і іншыя ўключаны ў праграму прадстаячых канцэртаў в'етнамскіх студэнтаў. Так, у нядзелю юнакі і дзяўчаты з далёкага В'етнама выступяць на трактарным заводзе на юбілейным вечары дапрызыўнай моладзі.

**НА ЗДЫМКУ:** у час агляду выступае хор; дырыжор — Святлана Вінаградава, акампаніруе Галіна Гаўрыкава. Фота Я. Данілава.

**Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.**

АТ 02080. Зак. 343. **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**